# УКАЗАННІ

## да афармлення і вядзення класнага журнала

1. Дадзены класны журнал вядзецца ва ўстанове адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму пачатковай адукацыі, і прызначаны для ўліку ходу адукацыйнага працэсу, наведвання вучнямі вучэбных заняткаў, вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў і ацэнкі іх паводзін у навучальным годзе і іншых звестак.

2. Пры наяўнасці ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі паралельных класаў у класным журнале адпаведнага класа, які азначаецца рымскімі або арабскімі лічбамі, указваецца літара. Напрыклад: 1 «А» клас, І «В» клас і г.д.

3. Старонкі класнага журнала, якія прызначаны для ўліку ходу адукацыйнага працэсу, наведвання вучнямі вучэбных заняткаў, вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах, размяркоўваюцца ў адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі і парадкам дзялення класаў на групы пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, які вызначаецца палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

Улік ходу адукацыйнага працэсу, наведвання вучнямі вучэбных заняткаў, якія ажыццяўляюцца ў групах, на якія дзеляцца класы, вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах, змест якіх накіраваны на развіццё здольнасцяў вучняў у галіне асобных відаў мастацтва, у базавай школе-каледжы мастацтваў, сярэдняй школе-каледжы мастацтваў, гімназіі-каледжы мастацтваў, а таксама ўлік карэкцыйных заняткаў і наведвання іх вучнямі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця вядзецца ў гэтым журнале.

4. Класны кіраўнік, настаўнікі, якія ажыццяўляюць адукацыйны працэс па вучэбных прадметах у адпаведным класе, вядуць класны журнал на беларускай і (або) рускай мове ў залежнасці ад мовы (моў) навучання і выхавання ва ўстанове адукацыі (беларускай і (або) рускай мове), акрамя старонак, якія адведзены на ўлік ходу адукацыйнага працэсу, вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура» (вядуцца на беларускай мове), «Руская мова», «Руская літаратура» (вядуцца на рускай мове). Ва ўстановах адукацыі, у якіх навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на мове нацыянальнай меншасці, класны журнал вядзецца на адной з дзяржаўных моў.

5. Спіс вучняў класа (груп, на якія дзеліцца клас) запаўняецца ў алфавітным парадку.

У класах інтэграванага навучання і выхавання вучні з асаблівасцямі развіцця ўключаюцца ў спіс вучняў класа.

6. Назвы вучэбных прадметаў, у тым ліку і пры запаўненні раскладу вучэбных заняткаў, пішуцца з малой літары: беларуская мова, руская мова, англійская мова, літоўская мова, чалавек і свет і г.д.

7. На левай старонцы класнага журнала, адведзенай на ўлік вучэбных заняткаў, наведвання вучнямі вучэбных заняткаў і вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па адпаведным вучэбным прадмеце, дата правядзення вучэбных заняткаў запісваецца наступным чынам: 01.09;

насупраць прозвішча і ўласнага імя вучня, які асвойвае змест адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам, робіцца запіс – «вывучае самастойна ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам». Пры неабходнасці дапускаецца скарачэнне слоў у адпаведнасці з правіламі арфаграфіі і пунктуацыі;

літарай «н» адзначаецца адсутнасць вучня на вучэбных занятках;

насупраць прозвішча і ўласнага імя вучня, які вызвалены ад вывучэння вучэбнага прадмета, робіцца запіс – «вызвалены» або «вызвалена» (які па стане здароўя аднесены да спецыяльнай медыцынскай групы або да групы лячэбнай фізічнай культуры, робіцца запіс – «СМГ» або «ЛФК»);

выстаўляюцца адзнакі па выніках бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі вучняў.

8. На правай старонцы класнага журнала, адведзенай на ўлік зместу вучэбнага прадмета, які асвойваецца на вучэбных занятках у адпаведнасці з вучэбнай праграмай гэтага вучэбнага прадмета, самастойнай дзейнасці, запісваюцца дата правядзення вучэбных заняткаў і з вялікай літары – тэма, матэрыял якой вывучаецца на вучэбных занятках (у радках графы «Змест вучэбных заняткаў»), і віды заданняў для самастойнага выканання (у радках графы «Дамашняе заданне»). Напрыклад, запісы ў радку графы «Змест вучэбных заняткаў» афармляюцца наступным чынам – Кантрольная работа па тэме «_____», Дыктант (Пераказ або Сачыненне) і ўказваецца назва «_____».

У класах інтэграванага навучання і выхавання пры несупадзенні тэм, якія вывучаюць вучні з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на вучэбных занятках, тэмы вучэбных заняткаў запісваюцца ў два радкі ў адпаведным радку графы «Змест вучэбных заняткаў».

Запісы ў радку графы «Дамашняе заданне» афармляюцца наступным чынам – Верш «Дзіўныя чаравічкі» на памяць, Задачы № 1–3, старонка 18. Тэма вучэбных заняткаў, від работы могуць запісвацца ў два радкі ў адведзеным для гэтага радку. Кропка не ставіцца пасля напісання назвы тэмы вучэбных заняткаў, віда работы. Пры неабходнасці пры запісе тэмы, віда работы, заданняў для самастойнай дзейнасці дапускаецца скарачэнне слоў у адпаведнасці з правіламі арфаграфіі і пунктуацыі. Калі вучням даецца заданне на паўтарэнне, то гэта ўказваецца ў радку графы «Дамашняе заданне». Напрыклад: Паўтарэнне. Правапіс о, а, э. Пр. 116.

Па вучэбным прадмеце «Замежная мова» пры запаўненні радкоў графы «Змест вучэбных заняткаў» назва вуснай тэмы запісваецца адзін раз у адпаведнасці з вучэбнай праграмай па замежных мовах. У межах вуснай тэмы паслядоўна азначаецца канкрэтная сітуацыя маўлення і дзейнасць вучняў па авалоданні відамі маўленчай дзейнасці (гаварэнне, чытанне, успрыманне і разуменне мовы на слых, пісьмо/пісьмовае маўленне). Напрыклад: Семья. Диалогическая речь (у класным журнале ўстановы адукацыі, у якой навучанне і выхаванне ажыццяўляецца на рускай мове).

Пры запаўненні радка графы «Дамашняе заданне» па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» запісы робяцца з указаннем практыкаванняў (комплексаў практыкаванняў), тэарэтычных заданняў і абавязковай даты кантролю самога задання.

9. Адзнакі па выніках бягучага кантролю, тэматычнага кантролю выстаўляюцца ў графе, якая адпавядае даце іх правядзення.

Адзнакі за навучальнае сачыненне, пераказ, пераклад па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Руская мова», «Родная мова нацыянальнай меншасці» у III–IV класах выстаўляюцца ў выглядзе дробу ў адну графу (па меркаванні настаўніка).

Адзнака за праверку навыку чытання ў III–IV класах выстаўляецца з указаннем даты ў адну графу.

10. Адзнакі за кожную вучэбную чвэрць выстаўляюцца пасля запісу даты апошніх вучэбных заняткаў без пропуску радка, улік вучэбных заняткаў наступнай чвэрці таксама вядзецца без пропуску радка. Пасля адзнакі за чацвёртую чвэрць без пропуску радка выстаўляецца гадавая адзнака.

11. Старонкі класнага журнала, што адведзены на вучэбныя прадметы, па якіх адукацыйны працэс ажыццяўляецца ў групах, могуць выкарыстоўвацца і для ўліку правядзення факультатыўных заняткаў, заняткаў па фізічнай рэабілітацыі і музыкальна-рытмічных заняткаў (для вучняў санаторных школ-інтэрнатаў).

Улік правядзення факультатыўных заняткаў у групе, якая сфарміравана з вучняў паралельных або розных класаў, вядзецца ў класным журнале таго класа, у саставе групы якога больш вучняў.

12. Старонкі класнага журнала, якія адведзены на ўлік правядзення факультатыўных заняткаў, у тым ліку па асновах бяспекі жыццядзейнасці, стымулюючых, падтрымліваючых заняткаў, грамадска карыснай працы, запаўняюцца настаўнікам, які праводзіць адпаведныя заняткі.

13. Старонкі класнага журнала «Паказчыкі фізічнай падрыхтаванасці вучняў» запаўняюцца настаўнікам, які ажыццяўляе адукацыйны працэс па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе».

14. Старонкі класнага журнала «Улік арганізацыйна-выхаваўчай работы», «Агульныя звесткі аб вучнях», «Зводная ведамасць уліку вынікаў вучэбнай дзейнасці і паводзін вучняў», «Улік вучняў, якія выязджаюць на аздараўленне на працягу навучальнага года і ў перыяд канікул» запаўняюцца класным кіраўніком.

15. Старонка класнага журнала «Улік гадзін дадатковага кантролю вучэбнай дзейнасці вучняў» вядзецца настаўнікамі, якім выдзелены гадзіны дадатковага кантролю вучэбнай дзейнасці вучняў гэтага класа.

16. У выпадку памылковага выстаўлення адзнакі выпраўленне праводзіцца наступным чынам: няправільна пастаўленая адзнака ў радку закрэсліваецца, побач выстаўляецца правільная адзнака, унізе старонкі робіцца запіс: «Адзнака вучню (указваецца прозвішча і ўласнае імя) выпраўлена з (указанне адзнакі) на (указанне адзнакі)». Далей ставіцца подпіс настаўніка і дата.

17. Усе запісы ў класным журнале павінны рабіцца акуратна, разборліва, чарнілам або пастай сіняга або фіялетавага колеру (па рашэнні ўстановы адукацыі). Класны журнал пасля заканчэння навучальнага года захоўваецца ва ўстанове адукацыі на працягу пяці гадоў. Зводная ведамасць уліку вынікаў вучэбнай дзейнасці і паводзін вучняў – 25 гадоў.

18. Старонка «Кантроль за вядзеннем класнага журнала» вядзецца кіраўніком установы адукацыі або ўпаўнаважанай ім асобай.